ДУ «МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А. С. ПУШКІНА»

# *БІБЛІЯТЭКІ МІНШЧЫНЫ Ў 2022 ГОДЗЕ: АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ*

**МІНСК**
**2023**

УДК 02
ББК 78.3(4Беі)

Складальнікі: Т. А. Лаўрык, К. Д. Вярхоўская,
В. М. Гіль, П. А. Усцінаў, І. У. Ганчарова,
Н. П. Гарадзецкая

Карэктура тэксту: Н. П. Гарадзецкая

Адказны за выпуск: Т. А. Лаўрык

Бібліятэкі Міншчыны ў 2022 годзе: агляд дзейнасці / ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна» ; [складальнікі: Т. А. Лаўрык [і інш.] – Мінск, 2023. – 111 с.

У штогадовым выданні прадстаўлены агляд дзейнасці публічных бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры ў Минскай вобласці за 2022 год.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, кіраўнікоў органаў кіравання культурай, а таксама для тых, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў вобласці.

# ЗМЕСТ

**Лаўрык Т. А.** Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва........................................................................4

**Вярхоўская К. Д.** Змест і арганізацыя работы з чытачамі......7

**Лаўрык. Т. А.** Бібліятэчнае абслугоўванне людзей з абмежаванымі магчымасцямі ..................................................38

**Лаўрык Т. А.** Работа бібліятэк у рамках Года гістарычнай памяці ........................................................40

**Усцінаў П. А.** Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне...............................................................................45

**Гіль В. М.** Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду ..............................................................................60

**Лаўрык Т. А.** Метадычная дзейнасць.....................................62

**ДАДАТКІ** ..................................................................................71

# Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва

На 31.12.2022 сетку публічных бібліятэк Мінскай вобласці складаюць **400 бібліятэк:** абласная бібліятэка, 22 цэнтральныя раённыя і 1 гарадская.

На працягу 2022 г. сетка **скарацілася на 33 адзінкі.** З улікам канкрэтнай дэмаграфічнай сітуацыі ў зоне культурнага абслугоўвання, запатрабаванасці насельніцтвам паслуг у сферы культуры зачыненыя 13 гарадскіх і сельскіх бібліятэк (Вілейскі, Клецкі, Капыльскі, Любанскі, Мядзельскі, Салігорскі раёны); рэарганізаваны 14 сельскіх бібліятэк у клубы-бібліятэкі (Бярэзінскі, Вілейскі, Капыльскі, Лагойскі, Нясвіжскі, Старадарожскі, Уздзенскі раёны); 5 дзіцячых бібліятэк (Бярэзінскі, Маладзечанскі, Мядзельскі, Стаўбцоўскі, Уздзенскі раёны); 1 гарадскі філіял аб'яднаны з раённымі цэнтральнымі бібліятэкамі (Вілейскі раён) (Дадатак 1).

На 31.12.2022 абслугоўванне аддаленых ад стацыянарных устаноў культуры маланаселеных пунктаў ажыццяўлялі **18 бібліёбусаў** (13 – бібліёбусаў знаходзіцца на балансе бібліятэк, 5 – транспартных сродкаў, якія выдзяляюцца іншымі ўстановамі для пазастацыянарнага абслугоўвання; дадатак 2), **194 бібліятэчных пунктаў**. Комплекснае прадастаўленне культурных паслуг насельніцтву ажыццяўляюць **42 бібліятэкі-клуба**. Адной з формаў комплекснага вырашэння сацыяльных, культурных і адукацыйных задач у жыцці сельскага насельніцтва застаецца функцыянаванне **145 інтэграваных** сельскіх публічных і школьных бібліятэк (з іх 7 бібліятэк сістэмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь).

Паслугамі публічных бібліятэк вобласці ў 2022 годзе з адзіным фондам **5 555,5 тыс.** дакументаў карысталіся **386,7 тыс. чалавек**. Колькасць наведванняў бібліятэк у 2022 годзе склала **4 775 тыс.** (у тым ліку віртуальных – **725,2**), у 2021 годзе – **4 364,4** (у тым ліку віртуальных – **628,3)** (Дадатак 3).

Па стане на 01.01.2023 года адзіны фонд публічных бібліятэк Мінскай вобласці ўключае **6 148** тыс. экзэмпляраў дакументаў. Асноўную частку бібліятэчнага фонду складаюць выданні на папяровых носьбітах – **99,1%**. За 2022 год у бібліятэкі вобласці паступіла **241,9 тыс.** экзэмпляраў дакументаў. За 2022 год паказчык абнаўлення фондаў бібліятэк склаў **3,9%**, за 2021 год – **3,7%**.

Даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 кастрычніка 2016 г. прадпісана накіроўваць на камплектаванне фондаў бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры не менш як 12 % сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне ўказаных устаноў.

У 2022 годзе на ўтрыманне публічных бібліятэк з бюджэту вобласці было накіравана 22 751 032,60 рублёў. Выдаткі на камплектаванне бібліятэчных фондаў склалі **2 785 451,28 рублёў**, з іх на набыццё дакументаў **1 329 175,14 рублёў** (47,7%), на набыццё электронных рэсурсаў або правоў доступу да іх – **58.329,58 рублёў** (2,1%), на падпіску перыядычных выданняў – **1 397 946,56 рублёў** (50,2%).

Такім чынам, удзельная вага сродкаў, накіраваных на камплектаванне фондаў публічных бібліятэк за 2022 год, у сярэднім па вобласці склала **12,8%** (абласная бібліятэка – **12,1%**, бібліятэкі раёнаў і г. Жодзіна – **12,8%**).

Неабходнай умовай для паляпшэння якасці бібліятэчных фондаў з'яўляецца своечасовае выяўленне і выключэнне састарэлых па зместу, зношаных і дублетных дакументаў. За 2022 год з фондаў публічных бібліятэк вобласці было выключана **471,7** экзэмпляра дакументаў.

У межах выдзеленых бюджэтных сродкаў на камплектаванне фондаў бібліятэкамі ажыццяўлялася закупка сацыяльна значных выданняў. За 2022 год на гэтыя мэты накіравана **323 035,61 рублёў** або **24,3%** ад сумы закупкі кніжных выданняў. Усяго набыта **24 825 экзэмпляраў** сацыяльна значных выданняў у адпаведнасці з «Тематическим планом выпуска социально значимых изданий» і «Рекомендаций для закупки публичными

библиотека и библиотеками учреждений образования», зацверджаным Міністэрствам інфармацыі.

Забяспечана 100-працэнтная камп'ютарызацыя бібліятэк з падключэннем іх да глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт. Парк камп'ютарнай тэхнікі складае **1156** камп'ютараў, з іх былыя ў эксплуатацыі звыш 10 гадоў – **525** адзінак (45,4%), 5-10 гадоў – **443** адзінкі (38,3%), да 5 гадоў – **188** адзінак (16,3%). У 2022 годзе быў набыты **71** камп'ютар наступнымі раёнамі: Бярэзінскім, Вілейскім, Дзяржынскім, Клецкім, Любанскім, Мінскім, Маладзечанскім, Нясвіжскім, Старадарожскім, Стаўбцоўскім, Чэрвеньскім, а таксама абласной бібліятэкай (Дадатак 4).

Усяго па вобласці **выхад у глабальную сетку і электронную пошту маюць 400 бібліятэк – 100%** ад агульнай колькасці.

На базе публічных бібліятэк Мінскай вобласці ў 2022 годзе дзейнічала **599** клубаў і аматарскіх аб'яднанняў (для дзяцей – **439**). Колькасць удзельнікаў склала **6691** чалавек (дзяцей – **4462**). Найбольшая колькасць клубаў дзейнічае ў наступных раёнах: Слуцкі, Мінскі, Салігорскі, Барысаўскі.

На 01.01.2023 у публічных бібліятэк Мінскай вобласці колькасць работнікаў складае **1 425** чалавек, у тым ліку кіраўнікі – **273**, спецыялісты – **825**, з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй – **419**, з сярэдняй спецыяльнай – **253**.

У 2022 годзе актыўна вялася работа па метадычным суправаджэнні дзейнасці публічных бібліятэк Мінскай вобласці ДУ «Мінская абласная бібліятэка ім. А.С. Пушкіна» ў рамках куратарства. З мэтай аказання метадычнай дапамогі і вывучэння выканальніцкай дысцыпліны супрацоўнікамі абласной бібліятэкі было ажыццёўлена **23** выезды і наведаны **83** бібліятэкі.

# Змест і арганізацыя работы з чытачамі

## Прававое выхаванне

На працягу года бібліятэкі вобласці праводзілі мэтанакіраваную работу сярод сваіх карыстальнікаў у дапамогу прававому выхаванню. Бібліятэкі прадастаўлялі доступ да прававой і сацыяльна-значнай інфармацыі насельніцтву, распаўсюджвалі прававыя веды.

ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» з 2016 года рэалізуе праект па фарміраванні прававой культуры насельніцтва «Библиотека. Общество. Право». У яго рамках ажыццяўляецца сістэматызаваная падборка дакументаў па пэўнай тэматыцы або прымеркаваная да пэўнай каляндарнай даты, створаны інфармацыйна-выставачны комплекс «Человек и закон», на якім увесь час размяшчаюцца і актуалізуюцца кніжна-ілюстрацыйныя выставы.

На сайце http://villib.by/ ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік» у рамках Тыдня фінансавай пісьменнасці была размешчана інфармацыя «Будь осторожен онлайн! Молодежь и цифровая безопасность», інфармацыйныя матэрыялы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь «Цифровая грамотность в финансовой сфере». На працягу года на бібліятэчным сайце была размешчана інфармацыя пра рэспубліканскую прафілактычную акцыю «Декада безопасности «Кибердети»», «В БГУ откроют специальность «кибербезопасность»», відэаролік «Как не стать жертвой киберпреступника», «Профилактика и противодействие киберпреступности».

На сайце ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» сістэматычна папаўняецца рубрыка «Безопасность жизнедеятельности» https://rcb.solcult.by/bezopasnost-zhiznedeyatelnosti/, дзе размяшчаюцца матэрыялы па фарміраванні навыкаў здаровага ладу жыцця і асновам бяспекі жыццядзейнасці.

Галоўнай падзеяй 2022 года стала правядзенне **Рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь**. Бібліятэкі актыўна ўключыліся ў работу па інфармаванні насельніцтва і размяшчалі інфармацыю як на стэндах, так і на сайтах бібліятэк, арганізоўвалі выставы і тэматычныя паліцы, размяшчалі інфармацыйныя матэрыялы з датай правядзення рэферэндуму ў сацыяльных групах бібліятэк рэгіёну.

На базе музейна-выставачнага комплексу «Партнёры. Друзья. Побратимы» ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» працавала грамадская прыёмная, у якой прыём грамадзян ажыццяўлялі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый. На афіцыйным сайце размешчаны банер «Контитуция: в будущее вместе», за якім былі размешчаны графік працы грамадскай прыёмнай па абмеркаванні праекта змяненняў дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у Барысаўскім раёне, Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 14, рашэнне Барысаўскага раённага выканаўчага камітэта, Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў, Рашэнне Барысаўскага раённага выканаўчага камітэта і інш. 8 лютага 2022 года ў канферэнц-зале ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» адбылася дыялогавая пляцоўка па падрыхтоўцы да рэферэндуму і ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь з удзелам дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання Л.С. Ананіч.

У Ланской інтэграванай сельскай бібліятэцы ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы» прайшла дыялогавая пляцоўка па абмеркаванні змяненняў у Канстытуцыю «Во имя независимости и

процветания». На сустрэчы прысутнічалі актыўныя жыхары аграгарадка Лань, прадстаўнікі ААТ «Лань-Нясвіж», пенсіянеры. Старшыня выканкама Т.У Шумоўская распавяла пра змены, якія падрыхтаваны для ўнясення ў асноўны закон краіны, пра іх адметныя бакі. Бібліятэкар прапанавала падборку актуальнага матэрыялу на гэтую тэму.

У рамках адкрытага дыялогу па абмеркаванні праекта абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у Палацы культуры г. Салігорска раённай цэнтральнай бібліятэкай была арганізавана інтэрактыўная пляцоўка «Адзіная і непаўторная Беларусь». На базе ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» адбылася дыялогавая пляцоўка па абмеркаванні праектаў закона аб Усебеларускім народным сходзе і змяненняў нормаў Выбарчага кодэкса, арганізаваная рэдакцыяй газеты «Шахцер».

Ва ўсіх бібліятэках адбыліся мерапрыемствы, якія садзейнічалі **павышэнню ўзроўня прававой культуры**, фарміраванню пачуцця годнасці, самапавагі, грамадзянскай адказнасці. Бібліятэкі працавалі ў гэтым накірунку плённа, выкарыстоўвалі найбольш эфектыўныя дыялогавыя формы работы, запрашалі на сустрэчы супрацоўнікаў праваахоўных органаў, юрыстаў, педагогаў, супрацоўнікаў сацыяльных службаў. Прайшоў шэраг карысных і дзейсных мерапрыемстваў для розных катэгорый карыстальнікаў.

У 2022 годзе ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» арганізавала сустрэчы супрацоўнікаў працоўнага калектыву ўстановы з натарыусам Мінскай абласной натарыяльнай акругі І.Я. Лобач, якая ажыццяўляе дзейнасць у натарыяльнай канторы Барысаўскага раёна. Падчас сустрэч натарыус асвятліла тэмы, якія найбольш хвалююць барысаўчан, патлумачыла асаблівасці здзелак і афармлення спадчынных правоў па прыватызаваных жылых памяшканнях, што з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю мужа і жонкі; для чаго патрэбен шлюбны дагавор, а таксама чаму аддаць перавагу: дарэнню або завяшчанню.

У канцы лістапада супрацоўнікі ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» правялі мерапрыемства «Законопослушный гражданин», на якое былі запрошаны вучні Валожынскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя. Супрацоўнікі бібліятэкі распавялі падлеткам, што такое правапарушэнне, злачынства, крымінальная адказнасць, калі наступае крымінальная, адміністрацыйная, дысцыплінарная і грамадзянска-прававая адказнасць непаўналетніх. З падлеткамі былі праведзены віктарына «Знаешь ли ты закон?» і гульня «Определи виды юридической ответственности при рассмотрении различных правонарушений».

У Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» прайшоў адкрыты дыялог моладзі. Актывісты раённай арганізацыі БРСМ і спікеры пляцоўкі Вольга Ігнатава, намеснік старшыні Дзяржынскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях і Аляксей Таўстыка, член Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, настаўнік гісторыі ДУА «Дварышчанскі ВПК яслі-сад – сярэдняя школа» вялі дыялог па пытаннях, якія датычацца маладзёжнай палітыкі і рэалізацыі патэнцыялу моладзі ў інтарэсах грамадства, захавання гістарычнай памяці, гатоўнасці да грамадска-карыснай працы, адказных адносін да свайго здароўя. Атрымаўся шчыры дыялог, на многія пытанні юнакі і дзяўчаты атрымалі вычарпальныя адказы.

Актуальную размову «Воспитай в себе гражданина» правялі супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» для навучэнцаў ДУА «Абласны аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй». Моладзь актыўна вяла дыскусію аб правах і абавязках грамадзян, абмяркоўвала змены Канстытуцыі, ад якіх залежыць будучыня не толькі кожнага грамадзяніна, але і будучыня Рэспублікі Беларусь. У

займальным падарожжы па станцыях патрыятычнага квэста «Сімвалы Беларусі» маладыя людзі даведаліся цікавыя факты пра славутых беларусаў, нацыянальныя брэнды, дзяржаўныя сімвалы і прыродныя рэсурсы нашай краіны.

На сённяшні дзень вельмі востра стаіць праблема крадзяжу грашовых сродкаў з рахункаў грамадзян ашуканцамі, якія тэлефануюць на тэлефоны і выведваюць канфедынцыйную інфармацыю. З мэтай павышэння інфармацыйнай культуры супрацоўнікаў бібліятэк Капыльскага раёна быў арганізаваны круглы стол на тэму «Повышение уровня знаний населения в сфере цифровой безопасности. Киберпреступления и их профилактика». Прадстаўнікі Капыльскага РАУС – першы намеснік начальніка РАУС Д.М. Ліпніцкі і старшы оперупаўнаважаны крымінальнага вышуку А.Л. Мароцкі – праінфармавалі аб сучасных метадах і спосабах падману, мерах процідзеяння і прафілактыкі. У ходзе актыўнай гутаркі ўзнімаліся пытанні аб правілах бяспечных паводзін у інтэрнэт-прасторы, выкарыстанні банкаўскіх пластыкавых картак, спосабах абароны асабістай і карпаратыўнай інфармацыі на электронных носьбітах, а таксама работнікі бібліятэк падзяліліся асабістым вопытам зносін з ашуканцамі. На пачатку года адбылася сустрэча на тэму «Противодействие киберпреступности» з намеснікам начальніка па арганізацыйна-кадравай рабоце Капыльскага РАУС В.В. Рудакоўскім.

Гадзіна прававых ведаў «Подросток и правонарушения» прайшла ў Сваткаўскай сельскай інтэграванай бібліятэцы ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка» і была прысвечана Міжнароднаму дню правоў дзіцяці. Бібліятэкар расказала ўдзельнікам мерапрыемства, якія бываюць віды правапарушэнняў, чым праступак адрозніваецца ад злачынства, якая адказнасць надыходзіць за здзяйсненне правапарушэння. У ходзе мерапрыемства асвятляліся пытанні аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці

непаўналетніх за ўчыненне злачынстваў і правапарушэнняў; з якога ўзросту наступае крымінальная адказнасць і якія пакаранні прымяняюцца за іх учыненне. Таксама ўспомнілі эпізоды з дзіцячых кніг, у якіх былі парушаны правы герояў, прыводзіліся прыклады з асабістага жыцця.

Актуальныя праблемы моладзі асвятліў інспектар па справах непаўналетніх Нясвіжскага РАУС У.У. Іванісеня на інтэрактыўнай маладзёжнай пляцоўкі «Права и ответственность» у Заазерскай сельскай бібліятэцы ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы». З вялікай увагай дзеці слухалі статыстычныя дадзеныя па Нясвіжскім раёне аб правапарушэннях падлеткаў, аб незахаванні рэжыму дня школьнікаў, аб няшчасці ў сем’ях, аб негатыўных паводзінах непаўналетніх, якія прывялі да смерці. Інспектар па справах непаўналетніх прыводзіў прыклады жыццёвых сітуацый, разбіраў пытанні па тэме. Прававую тэму працягнуў старшы оперупаўнаважаны групы наркагандлю і процідзеяння гандлем людзьмі крымінальнай міліцыі Нясвіжскага РАУС старшы лейтэнант А.А. Барыс, які распавёў аб тым, што кожны падлетак павінен абдумваць свае паводзіны загадзя, не паддаваўся на правакацыі іншых, вырашаў свой лёс ужо сёння.

Для навучэнцаў 1 курса філіяла БНТУ «Салігорскі дзяржаўны горна-хімічны каледж» у ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» прайшла гадзіна актуальнай інфармацыі «Ты і закон». Інспектар па справах непаўналетніх Салігорскага РАУС А.Г. Клімец расказала навучэнцам аб крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці непаўналетніх, перасцерагла маладых людзей ад ужывання алкагольных і наркатычных сродкаў, звярнула ўвагу на наступствы гэтых учынкаў.

ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» у рамках рэспубліканскай прафілактычнай акцыі «Дом без гвалту!», накіраванай на рашэнне праблем гвалту ў сям’і, прынясце мер уздзеяння ў дачыненні да асоб, якія ўчыняюць

правапарушэнні ў сферы сямейна-бытавых адносін, арганізавала шчырую размову «Свет без гвалту пачынаецца з кожнага». На мерапрыемстве прысутнічала начальнік ЛПП № 3 А.Р. Горбель, якая расказала навучэнцам сярэдніх спецыяльных устаноў аб разбуральным уплыве алкаголю на асобу чалавека, прывяла статыстычныя дадзеныя, якія сведчаць аб тым, што ў большасці выпадкаў хатні гвалт здзяйсняецца асобамі, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі. Да мерапрыемства была аформлена выстава-прагляд «Свет без гвалту», на якой былі размешчаны матэрыялы па тэме, а таксама нумары тэлефонаў даверу для пацярпелых ад хатняга гвалту.

У ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка» прайшла сустрэча «Без скидки на возраст» з загадчыкам юрыдычнай кансультацыяй В.І. Ладуцька, якая распавяла аб грамадзянска-прававой і адміністрацыйнай адказнасці падлеткаў за правапарушэнні, хуліганства. На мерапрыемстве прысутнічалі навучэнцы Чэрвеньскага прафесійнага будаўнічага ліцэя. Спецыяліст закранула такія праблемы, як наркаманія і суіцыд сярод моладзі, дала парады, як выйсці з цяжкіх сітуацый.

Кожны год 15 сакавіка адзначаецца дзяржаўнае свята – **Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь**. Да гэтай даты супрацоўнікі ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» падрыхтавалі інфармацыйны дайджэст «Канстытуцыя – люстэрка дэмакратычнага грамадства». Слухачамі мерапрыемства былі вучні Валожынскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя, якія пазнаёміліся з гісторыяй стварэння Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, з чаго яна складаецца. Напрыканцы мерапрыемства з вучнямі была праведзена віктарына «Я знаю Конституцию».

Для навучэнцаў ДУА «Абласны аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй» быў праведзены турнір знаўцаў у ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма». Моладзь актыўна адказвала на пытанні, падарожнічала па станцыях патрыятычнага квэста

«Гордимся, что мы – белорусы», падчас якога даведалася пра цікавыя факты аб нацыянальных сімвалах прыроды, гісторыі, знакамітых беларусах, нацыянальных брэндах Беларусі. Ганаровы госць сустрэчы, старшыня райкама прафсаюза работнікаў АПК Р.Смяян расказала моладзі аб змяненнях Канстытуцыі, якія былі прыняты па выніках Рэспубліканскага рэферэндуму: захаванне гістарычнай памяці, сацыяльная адказнасць кожнага грамадзяніна, традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, клопат грамадзян аб сваім здароўі. На памяць усе ўдзельнікі сустрэчы атрымалі падарунак ад бібліятэкі – інфа-буклет «15 марта День Конституции Республики Беларусь».

Да Міжнароднага **Дня аховы персанальных дадзеных** (28 студзеня 2022 года) ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» правяла акцыю, у рамках якой была аформлена выстава-імпульс «Будь на страже своих персональных данных». Ля выставы праводзіліся інформхвілінкі «Абарона персанальных дадзеных у тваіх руках», бібліятэкай быў падрыхтаваны інфармацыйны буклет «Правілы абароны персанальных дадзеных», у якім размяшчаліся звесткі аб тым, што такое персанальныя даныя, чым пагражае іх ўцечка, як абараніць свае персанальныя дадзеныя ў Інтэрнэце.

## Экалагічнае выхаванне

Экалагічная асвета і адукацыя – неад’емная частка маральнага выхавання асобы з ранняга дзяцінства і на працягу ўсяго жыцця. Таму бібліятэкі Міншчыны праводзяць цікавую і мэтанакіраваную работу па экалагічнай асвеце разнастайных катэгорый наведвальнікаў бібліятэк.

Супрацоўнікамі дзіцячага аддзела ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» да Сусветнага дня запаведнікаў і нацыянальных паркаў распрацавана віртуальная выстава «Тропинками родного края (из истории заповедных мест Борисовского района)» і размешчана на афіцыйным сайце бібліятэкі ў раздзеле «БиблиоГид» https://www.borlib.by/chitatelyam-2/virtualnye-

vystavki-ru/7419-tropinkami-rodnogo-kraya, рэсурс знаходзіцца ў адкрытым доступе.

Назапашванню інфармацыі па экалогіі, ахове навакольнага асяроддзя садзейнічае электронная тэкставая база даных «Мядзельшчына – край блакітных азер», якая функцыянуе ў ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка». У базе размешчаны матэрыял мясцовага характару: пра ахову асяроддзя, экалогію края, сацыяльна-эканамічныя пытанні аховы прыроды, праблемы развіцця Нарачанскага рэгіёну. Рэсурс дапамагае чытачам хутка атрымаць інфармацыю з апошніх публікацый. У гэтым годзе база даных папоўнілася матэрыяламі з рубрыкі «Вандруем па малой Радзіме» з раённай газеты «Нарачанская зара».

Вельмі цікава праходзяць прэзентацыі кніг на экалагічную тэму. Так, бібліятэкары Нарацкай пасялковай бібліятэкі ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка» правялі прэзентацыю новай кнігі У. Ягоўдзіка «Вочы зямлі: вандроўкі па роднай Беларусі». Кніга прысвечана багаццям беларускай прыроды, у яе звесткі пра рэкі і азёры аўтар спалучае з легендамі і паданнямі. Мэта мерапрыемства – навучыць падлеткаў жыць у суладдзі з прыродай, берагчы кожную травінку і крынічку.

**Тэма аховы навакольнага асяроддзя** разглядалася на наступных мерапрыемствах: экаінфарміна «Вада – крыніца жыцця», урок экаэтыкету «Час збіраць смецце», экалагічная гульня «Экалагічная сцяжынка» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»); эрудыт-падарожжа па лясных сцяжынках «Прырода – наш агульны дом», пазнавальны пазл «Падарожжа па зімовых месяцах», пазнавальная гадзіна «Беларускія балоты – багацце нашай краіны», экстраннае паведамленне «Зямля наш дом, але не адны мы ў ім жывём», інфармацыйны дыялог «Навошта нам сабакі», экалагічнае лата «Земля заветная» (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі»); круглы стол «Жыві, планета Зямля!», гадзіна

карысных парад «Прыгажосцю кветак сэрца ўзята ў палон», акцыя «Кветкі – душэўнай прыгажосці сведкі», цыкл гутарак «Прырода і экалогія Беларусі» (ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка») і іншыя.

**Да 36-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС** бібліятэкарамі Багданаўскай сельскай бібліятэкі ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» быў падрыхтаваны аповед-роздум «Чарнобыль. Урокі праз гады» з аднайменнай выставай, на якой акрамя літаратуры на экалагічную тэму, аб стане радыелагічнай сітуацыі на дадзены момант, былі прадстаўлены творы мастацкай літаратуры, у якіх былі закрануты тэмы аб выніках аварыі, аб лёсах пакінутых вёсак і іх жыхароў: апавяданне Ніны Рыбак «Эвакуацыя», Андрэя Федарэнкі «Бляха», Івана Пташнікава «Львы», раман Івана Шамякіна «Злая зорка», а таксама артыкулы з перыядычных выданняў, якія пазнаёмілі з успамінамі ліквідатараў вынікаў аварыі на ЧАЭС, аб пакінутых вёсках і загубленых жыццях. Галоўная мэта мерапрыемства – уратаваць свой край у будучым ад разбуральных катастроф дзеля наступнага пакалення.

Раённая акцыя памяці «Чернобыль. Это забыть нельзя», прысвечаная 36-гадовай гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС, прайшла ў публічных бібліятэках ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі». У рамках акцыі ў Сасноўскай сельскай бібліятэцы, філіяле № 38 прайшоў прагляд відэаматэрыялаў «Двадцать секунд, которые потрясли мир». Мерапрыемства пачалося з агляду кніжнай выставы «Звон жалобны над краем», пры афармленні якой была выкарыстаная сімволіка акцыі. Бібліятэкар расказала ўдзельнікам аб трагедыі, якая адбылася на Чарнобыльскай АЭС трыццаць шэсць гадоў таму, аб мужнасці і гераізме, тых людзей, хто прыняў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі.

У ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка» была падрыхтавана і аформлена выстава-рэквіем «Чернобыль. Черный апрель 1986», накіраваная на

патрыятычнае і экалагічнае выхаванне чытачоў. На выставе была прадстаўлена мастацкая і дакументальная літаратура, перыядычныя выданні на гэту тэму, успаміны сведак і ўдзельнікаў ліквідацыі. Таксама можна было ўбачыць фотарэпрадукцыі вядомага беларускага мастака Міхаіла Савіцкага з маштабнага цыкла «Чорная быль», які прысвечаны памяці ахвяр Чарнобыльскай катастрофы. На выставе была прадстаўлена літаратура і перыядычныя выданні пра падзеі тэхнагеннай катастрофы, успаміны непасрэдных сведак і ўдзельнікаў ліквідацыі Чарнобыльскай аварыі, погляды ўрачоў, журналістаў, навукоўцаў на саму аварыю і яе наступствы. Мэта выставы – успомніць пра падзеі на Чарнобыльскай АЭС, ушанаваць памяць тых, хто не шкадуючы жыцця і здароўя, стаў на барацьбу з радыяцыйнай стыхіяй, навучыцца ўспрымаць чужую бяду, чужы боль як сваю ўласную, выхоўваць адказнасць за ўсё, што адбываецца навокал.

У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы» адбылася сустрэча з ліквідатарамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС І.А. Ходусам і Д.В. Шышам «Живые голоса героической судьбы». Падчас сустрэчы быў прадэманстраваны фільм пра выбух чацвёртага рэактара Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Госці ў сваю чаргу распавялі пра свой удзел у ліквідацыі наступстваў самай буйной тэхнагеннай катастрофы XX стагоддзя, пра сваіх таварышаў, дзякуючы якім удалося паменшыць маштабы наступстваў аварыі для экалогіі СССР і краін Усходняй Еўропы. Рызыкуючы жыццём і здароўем, ліквідатары наступстваў аварыі атрымалі перамогу ў смяротнай сутычцы з ядзернай стыхіяй.

Працягвае работу **клуб** аматараў-кветкаводаў «Лотас» у Свірскай пасялковай бібліятэцы ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка». За 2022 год адбылося 6 пасяджэнняў па тэмах: «Хризантемы: выбираем сорта», «Кустарник спирея – уход и размножение»,

«Пальма в саду: клещевина», «Флоксы – пересадка, черенкование, уход», «Бахромчатые тюльпаны», «Царь цветов – пион».

## Здаровы лад жыцця

Фарміраванне ў карыстальнікаў матывацыі і звычкі да вядзення здаровага ладу жыцця – значны напрамак дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці. Бібліятэкі каардынавалі сваю дзейнасць з установамі культуры і адукацыі, медыцынскімі ўстановамі, праводзілі комплекс разнастайных мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю здаровага ладу жыцця. Выкарыстоўваліся дыялогавыя формы: віктарыны, інфармацыйныя гадзіны, урокі здароўя, урокі-дыялогі, урокі-папярэджанні, вусныя часопісы, гадзіны карысных парад. Штогод на тэму здаровага ладу жыцця выдаюцца інфармацыйныя памяткі, буклеты, закладкі.

У рамках прафілактычнага раённага праекта «Беразіно – здаровы горад» (2019–2022) ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» былі рэалізаваны акцыі і дні здароўя з далучэннем насельніцтва да ўдзелу ў масавых мерапрыемствах. У рамках нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце» жыхарам райцэнтра, ветэранам фізкультуры і спорту была прапанавана сустрэча з бегуном-марафонцам, прызёрам чэмпіянату РБ і першанстваў Еўропы і свету, міжнародных марафонаў і паўмарафонаў Генадзем Жаўронкам. Аматар бегу падзяліўся самымі яркімі ўражаннямі аб удзелах у марафонах, раскрыў сакрэты свайго захаплення бегам, распавёў пра карыснасць заняткаў спортам, у прыватнасці, бегам для людзей сталага ўзросту.

Масавы запыт у віртуальных карыстальнікаў бібліятэчнага сайта ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» атрымалі віртуальныя выставы і інфарм-дайджэсты «Ведаць, каб не памыліцца», «Курыць – здароўю шкодзіць», «Стань вольным ад шкодных звычак».

На метадычных днях бібліятэчных работнікаў ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі» разглядаліся пытанні па прафілактыцы

здаровага ладу жыцця: метадычныя рэкамендацыі ў дапамогу работы па фарміраванню ЗЛЖ «Информационная деятельность библиотек по профилактике асоциальных явлений», работа бібліятэк па ЗЛЖ падчас летніх канікул «Лето без опастностей», бібліяграфічны агляд сцэнарных распрацовак «Твой путеводитель по здоровому образу жизни»; агляд новай літаратуры «Залежнасць: шляхі пераадольвання розных відаў залежнасцей» і інш. Аддзел бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваў метадычныя рэкамендацыі па прафілактыцы шкодных звычак «Привычки, которые губят».

На сайце ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі» ў рубрыцы «Это должен знать каждый!» і ў сацыяльнай сетцы УКантакце былі размешчаны інфармацыйныя рэсурсы і сацыяльныя ролікі: «Легкие и быстрые деньги. А что потом?»; «Предлагают стать наркозакладчиком»; «Что делать, если вы нашли наркотики?», «Возраст начала потребления наркотиков»; «Что надо знать родителям о синтетических наркотиках?»; «Спорт и наркотики – две разные вещи»; «Как определить, что ваш ребенок употребляет наркотики?»; відэаролік «Книга против наркотиков» і інш.

У 2022 годзе бібліятэкі Лагойскага раёна працягвалі працаваць у межах раённай мэтавай доўгатэрміновай праграмы «Мы – за здаровую будучыню» (2022), а таксама ў рамках рэалізацыі прафілактычнага праекта «Лагойск – здаровы горад», «Плешчаніцы – здаровы пасёлак», «Астрошыцы – здаровы пасёлак» (2021–2025). У кантэксце дадзенай праграмы і праектаў праводзіўся комплекс мерапрыемстваў, якія актыўна прапагандуюць здаровы лад жыцця, садзейнічаюць прафілактыцы шкодных звычак сярод насельніцтва. Бібліятэчныя мерапрыемствы праводзіліся сумесна з навучальнымі і медыцынскімі ўстановамі, сем’ямі. У гэтым кірунку выкарыстоўваліся наступныя формы работы: квэст-гульня, падарожжа, інфармацыйна-забаўляльны мікс, інфарміна і іншыя.

На афіцыйным сайце ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі» папаўняецца інфармацыйнымі і агітацыйна-прафілактычнымі матэрыяламі рубрыка «За здоровый образ жизни» (https://guk-luban.net.by/?p=5454)

Заслаўская гарадская бібліятэка ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» працягвае ажыццяўляць праект «Горад Заслаўе – здаровы горад». У горадзе дзейнічае тэрэнкур «Тропа здоровья». Для моладзі ў бібліятэцы была арганізавана гутарка-роздум «Молодежь за здоровый образ жизни». Мерапрыемства прайшло ў фармаце «адкрытага дыялога». Бібліятэкары правялі віктарыну «Знатоки здорового образа жизни», распрацавалі і раздалі вучням тэматычныя памяткі і буклеты «Правила здорового образа жизни». З мэтай эфектыўнага ўздзеяння на разуменне маладога пакалення выступіла медсястра дзіцячай паліклінікі Н.У. Голуб з тэмай «Здоровье подрастающего человека».

У фарміраванні прэстыжу здаровых паводзін, папулярызацыі філасофіі пазітыўных адносін да спорту і выхавання патрэбы ў здаровым ладзе жыцця вялікая роля належыць бібліятэкам. У 2022 годзе бібліятэкі ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» працягвалі працу ў рамках інфармацыйна-асветніцкай праграмы «За здаровы лад жыцця», якая складаецца з пяці падпраграм: «Інфарм-кур'ер», «Люстэрка», «Выратаванне», «Сямейны лабірынт», «Бібліятэрапія». Падпраграмы складаюць комплекс мерапрыемстваў па фарміраванні здаровага ладу жыцця, маральным выхаванні асобы, сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі моладзі і падлеткаў, прафілактыцы шкодных звычак, псіхалагічнаму і духоўнаму камфорту сям'і, пераадоленні крызісных сітуацый з дапамогай кнігі і чытання.

Ва ўсіх бібліятэках працавалі пастаянная кніжныя выставы і выставы інфармацыйных матэрыялаў па ЗЛЖ і прафілактыцы шкодных звычак: «Быть здоровым, красивым, успешным», «Веды засцерагаюць ад памылак», «Соблазн

велик, но жизнь дороже», «Не отнимай у себя завтра», «К здоровью через книгу» (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); «Кніга на службе здароўя», «Дзіўны свет лекавых раслін», «Скажам курэнню – «не»!» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»); «НаркоStop! », «Не пью и не буду! », «Вместе против СПИДа», «Курение – опастная ловушка», «Жизнь – это счастье! Сотвори его сам!», «Супраць наркотыкаў – моладзь свету!» (ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік»); «Торгуешь наркотиками? Убиваешь будущее», «Убивает наркотик, но убийца закладчик», «Торгуешь смертью?», «Безответственность родителей – ответственность детей», «Они знали, но не думали о последствиях» (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі»); «Алкоголь – враг семьи, общества, здоровья» , «За здаровы лад жыцця», «Здароўе – жыцця крыніца», «Асцярожна, СНІД!», «Жыццё. Здароўе. Даўгалецце», «Зберажы сябе для жыцця» (ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»); «Вобраз жыцця і шкодныя звычкі», «Як зберагчы сваё здароўе?», «Здароўе – галоўнае багацце» (ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»); актуальная паліца «Час спорта – час здоровья», віртуальная выстава «Серьёзный разговор», выстава-падказка «Книга поможет здоровье умножить» (ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»).

На працягу года ў бібліятэках для розных катэгорый карыстальнікаў праведзена мноства мерапрыемстваў па папулярызацыі **здаровага ладу жыцця:** кніжны нон-стоп «Асцярожна: наркотык» па аповесці В.Гапеева «Ксюхіна поле», інфармацыйная гадзіна «Наркашоп і яго наступствы» (ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»); літаратурна-спартыўная гульня «Вредным привычкам – книжный заслон!», мультымедыйны занятак «Соблазн – великий и ужасный!», гутарка-дыялог «Трудно быть подростком», кніжны марафон «Даже не пробуй», інфармацыйны дайджэст «Всё о наркомании», відэалекторый

«Наркомания – шаг в бездну», гадзіна барацьбы з наркаманіяй «Строим жизнь без наркозависимости», тэатралізаваная праграма «Сказка о том, как не надо зарабатывать деньги» (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі»); спартыўнае спаборніцтва «Альтернатива пагубным привычкам», гадзіна пытанняў і адказаў «Здаровае пакаленне – багацце краіны» (ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»); гутарка «Похититель рассудка – алкоголь», рэпартаж-агляд «Хачу жыць» (ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»); вусны часопіс «SOS. Оставайся на линии жизни», гадзіна зносін «Аб СНІДзе гучна і ўсур'ёз», акцыя «Захавай сябе для жыцця», прафілактычная імідж-акцыя «Выбери будущее без наркотиков» (ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка»); гадзіна зносін з элементамі трэнінгу «Как жить сегодня, чтобы иметь шансы увидеть завтра», прафілактычная гутарка «Вредные привычки: зона риска» (ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы»); інтэрактыўныя пазлы «Из чего состоит здоровье», інфармацыйна-прафілактычная акцыя «STOP! Наркотик!», крэатыў-клас «Наш выбор – здоровье и жизнь», бібліяквілт «Быть здоровым – это…» (ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»); meetup-сустрэча «PRO-активное долгожительство», дыялог пра здароўе «Искусство быть здоровым», турнір знаўцаў спорту «Я о спорте знаю всё», інфармацыйная вакцына «COVID-19: защити себя», ЗЛЖ-батл «Табак: the END», медыялекторый «Предупрежден – значит вооружен» (ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»); дыскусія «Книга или компьютер: все «за» и «против», час бяспекі «Если ситуация чрезвычайная», гадзіна здароўя «Спорт, здоровье, красота – в моей жизни навсегда», відэалекторый «Всё начинается с сигареты» (ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка»).

У жніўні на Капыльшчыне прайшоў спартыўна-культурны фестываль «Вытокі». Да гэтай падзеі Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкай імя А. Астрэйкі была

падрыхтавана экспрэс-выстава «Капыльшчына спартыўная» і інформ-хвілінкі «Знай нашых». Наведвальнікі бібліятэкі змаглі пазнаёміцца са спартыўнымі дасягненнямі А. Смольскага, А. Сымана, Р. Кныша, В. Скрабатун. У чытальнай зале бібліятэкі была аформлена выстава-экспазіцыя «Першы крок да Алімпу», якую ўпрыгожылі спартыўныя кубкі і медалі земляка спартсмена-лёгкаатлета, сярэбранага прызёра па бегу на 100 м. Дз. Була.

30 лістапада супрацоўнікамі абанемента Маладзечанскай цэнтральнай бібліятэкай імя Максіма Багдановіча для навучэнцаў ДУА «Маладзечанская санаторная школа-інтэрнат» было праведзена мерапрыемства, прысвечанае прафілактыцы камп’ютарнай залежнасці «Компьютерная зависимость: болезнь или обман?». Падчас сустрэчы прысутныя даведаліся пра станоўчыя і адмоўныя бакі інтэрнэту; праслухалі цікавыя факты аб кіберзалежнасці і павучальныя гісторыі з жыцця інтэрнэт-залежных. Навучэнцы з цікавасцю паўдзельнічалі ў экспрэс-тэсце на вызначэнне інтэрнэт-залежнасці і распавялі аб сваім стаўленні да інтэрнэту, прынялі ўдзел у гульні «Гэты прывабны свет інтэрнэту».

Ждановіцкая сельская бібліятэка ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» запрасіла на сустрэчу з загадчыцай аддзялення грамадскага здароўя Мінскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ю.В. Мітрайкінай «Остановись и подумай». Гаворка вялася пра небяспеку, якую нясе ўжыванне наркатычных сродкаў, алкаголя, тытуня моладдзю і падлеткамі, і як змагаецца грамадству з такімі хваробамі. Не абышлі ўвагай і знакамітых людзей, якія загінулі праз нарказалежнасць і алкаголь, гучала інфармацыя пра крымінальную адказнасць за захаванне, збыт і ўжыванне наркатычных рэчываў.

У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўла Пранузы была праведзена гадзіна адкрыццяў «Девочка. Девушка. Женщина». На сустрэчу быў запрошаны лекар акушэр-

гінеколаг А.Ю. Горбач, якая распавяла аб анатомна-фізіялагічных зменах, якія адбываюцца ў арганізме дзяўчыны ў пераходным узросце, аб асноўных этапах палавога паспявання. У ходзе гутаркі дзяўчаты атрымалі рэкамендацыі па гігіене цела, абутку і адзення, гігіене харчавання, раскрываліся праблемы, якія ўзнікаюць пры нядбайным стаўленні да свайго рэпрадуктыўнага здароўя (непажаданая цяжарнасць, аборты, інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам).

У 2022 годзе ў рамках праграмы «За здаровы лад жыцця» ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» вялася змястоўная работа па фарміраванні валеалагічнай культуры і павышэнні псіхолага-педагагічнага ўзроўню бацькоў. Праведзены цікавыя мерапрыемствы для бацькоў і дзяцей: інфармацыйная гутарка-рэкамендацыя «Здаровая сям'я – здаровая нацыя» (аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў раённай цэнтральнай бібліятэкі), скарбонка ЗЛЖ-парад «Здоровый образ жизни – здоровая и крепкая семья» (гарадская бібліятэка-філіял № 2), дыялог-дыскусія «Здоровое поколение – здоровая нация» (Гацукоўская сельская бібліятэка-філіял № 12), панарама карыснай інфармацыі «Семья – это важно» (Замосцкая сельская бібліятэка-філіял № 15), дыялог з чытачамі «Формула семьи или 100 рецептов счастья» (спецыялізаваная бібліятэка-філіял № 27), літаратурная фізкультхвілінка «Мама, папа, я – читающая и спортивная семья» (Навадворцаўская сельская бібліятэка-філіял № 30), гадзіна добрых парадаў «В семейном кругу мы с вами растём…» (Сорагская сельская бібліятэка-філіял № 43). Бібліятэкі ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» працавалі ў рамках праграмы, выкарыстоўваючы магчымасці і кірункі бібліятэрапіі. Карыстальнікі, як дарослыя, так і дзеці, з цікавасцю ўдзельнічалі ў мерапрыемствах, якія мелі мэтай праз кнігу і чытанне дапамагчы супрацьстаяць неардынарным сітуацыям (хваробам, стрэсам, дэпрэсіям). Увазе карыстальнікаў былі прадстаўлены: літаратурнае знаёмства з кнігай І. Токаравай

«Хочу жить!» «Безмолвный крик» (дзіцячы аддзел раённай цэнтральнай бібліятэкі), выстава-падказка «Книга поможет здоровье умножить» (гарадская бібліятэка-філіял №1), літаратурны навігатар «Проблемы наркомании в художественной литературе» (Гацукоўская сельская бібліятэка-філіял № 12), гучнае чытанне і абмеркаванне казкі С. Міхалкова «Как медведь трубку курил» (Грэская сельская бібліятэка-філіял № 14) і інш.

У ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» сумесна з ДУ «Смалявіцкі сацыяльна-тэрытарыяльны цэнтр» прайшла сустрэча з урачом-гігіеністам ДУ «Смалявіцкі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» Д.У. Кузьмічом, які падзяліўся інфармацыяй аб прафілактыцы гэтых захворванняў, а таксама расказаў наколькі важна зрабіць прышчэпку. Да мерапрыемства была падрыхтавана прэзентацыя кніжнай выставы «Наш сябар – здароўе» і відэапрэзентацыя «Грып і яго прафілактыка».

Урок-роздум «Як захаваць жыцце і здароўе» да **Сусветнага дня здароўя** праходзіў у Івянецкай гарпасялковай бібліятэцы ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка». Мэта мерапрыемства – захаваць і пашырыць веды падлеткаў пра шкоднае ўздзеянне курэння і алкаголю на арганізм чалавека. Праз правядзенне псіхалагічнага трэнінгу, гульняў «Я так думаю» і «Сумленне і спакуса», выкананне заданняў «Круг шкодных звычак», падлеткі прыйшлі да высновы, што толькі ад нашага выбару залежыць, ці будзем мы здаровыя, што трэба ўмець супрацьстаяць шкодным звычкам, весці здаровы лад жыцця.

Прафілактыцы тытунекурэння ў бібліятэках Міншчыны надаецца вялікае значэнне. Аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» да **Міжнароднага дня адмовы ад курэння** арганізаваў акцыю «Слуцк супраць тытуню». Для навучэнцаў старэйшых класаў школ горада бібліятэкары падрыхтавалі гутарку аб шкодзе цыгарэт, вейпаў, спайсаў «Як засцерагчы сябе ад шкодных звычак» і правялі агляд кніжнай выставы-

інсталяцыі «Гаворым здароўю – «ТАК». Дапоўнілі мерапрыемства інтэрактыўныя гульні, віктарыны, кніжны лабірынт.

Па **прафілактыцы наркаманіі** супрацоўнікі абанемента ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» падрыхтавалі відэаагляд кнігі А. Меліхава «Краденое солнце». У рамках праекта па прапагандзе здаровага ладу жыцця і прафілактыцы шкодных звычак «За здоровую молодость» абанемент бібліятэкі выдаў інфармацыйныя флаеры «Прочти – подумай» з анатацыямі да кніг, у якіх падымаецца праблема наркаманіі. Супрацоўнікамі агульнай залы распрацавана віртуальная выстава «Наркотики: мираж и действительность», у якой сабраны кнігі і перыядычныя выданні з фонду залы, якія раскрываюць тэму наркаманіі, якая размешчана на афіцыйным сайце ўстановы ў раздзеле «БиблиоГид» https://www.borlib.by/chitatelyam-2/virtualnye-vystavki-ru/6823-virtualnaya-vystavka-narkotiki-mirazh-i-dejstvitelnost. Супрацоўнікамі духоўна-асветніцкага цэнтра падрыхтаваны відэаагляд кнігі «Дикая маслина» https://www.youtube.com/watch?v=sLEZPb7C0Yc.

Сістэмна (2 разы ў год) праводзілася антынаркатычная прапаганда ў бібліятэках Бярэзінскага раёна. Навацыяй года стаў інфармацыйны агітбус «Бярэзінскі раён: тэрыторыя без наркотыкаў», зладжаны на базе раённага аздараўленчага лагера «Папараць-кветка» ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» сумесна з БСРМ і ўпраўленнем па адукацыі, спорту і турызму райвыкамкама, прафілактычных структур РАУС. Бібліятэкары прадставілі агіт-марафон «Наркотык абыходзь стараной». Тэатр-маналог дазволіў паказаць моладзевую праблему праз эмоцыі перажыванняў маладых наркаманаў, іх каханых і матуль.

З 14 па 20 сакавіка 2022 года бібліятэкі Пухавіцкага раёна прынялі ўдзел у міжведамаснай акцыі «Разам за здаровую будучыню», накіраванай на прафілактыку спажывання і збыту наркатычных рэчываў. У рамках акцыі ў

Мар'інагорскай гарадской бібліятэцы ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» прайшоў цыкл мерапрыемстваў. Для моладзевай аўдыторыі адбыўся валеалагічны круіз па прафілактыцы шкодных звычак «Здоровый образ жизни: PRO-движение». Бібліятэкары прапанавалі падлеткам прыняць удзел у творчых заданнях. Удзельнікі гульні склалі пасланне-зварот аднагодкам «Беражыце здароўе», раскрылі дзесяць фактаў пра наркотыкі, а таксама распавялі пра знакамітых людзей, якія памерлі або лячыліся ад наркатычнай залежнасці. У чытальнай зале была аформлена кніжная выстава «Наркаманія: дзесяць прыкмет надыходзячай небяспекі». Інфармацыйныя матэрыялы, прадстаўленыя на выставе, спрыялі стварэнню дыялогу, падчас якога падлеткі абмяркоўвалі прычыны ўжывання рознага роду псіхаактыўных рэчываў, называлі спосабы адмовы ад спакус.

У Сяражскай сельскай інтэграванай бібліятэцы-філіяле № 4 ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» для вучняў 9 класа ДУА «Сяражская сярэдняя школа» быў праведзены дзень інфармацыі «Наркотыкі і дзеці. Як захаваць будучыню?», прымеркаваны да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй і незаконным абаротам наркотыкаў. Падчас дня інфармацыі бібліятэкар прадставіла інфармацыю аб шкодзе наркотыкаў, пра небяспечныя наступствы першага ўжывання наркатычных рэчываў. З удзельнікамі былі праведзены гульні «Піраміда» і «Сем спосабаў сказаць «Не». Разам з бібліятэкарам падлеткі развеялі некаторыя міфы аб наркаманіі і аднадушна выказаліся за здаровы лад жыцця. Да мерапрыемства была аформлена выстава-прагляд «Ведаць, каб не спатыкнуцца!». Бібліятэкар правяла агляд літаратуры, прадстаўленай на выставе.

З мэтай павышэння ўзроўню інфармаванасці і адукаванасці па **праблеме ВІЧ/СНІДу** 30 лістапада ў гарадской бібліятэцы № 1 ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» адбыўся адкрыты дыялог «ВИЧ/СПИД: знание может спасти», у якім прынялі

ўдзел навучэнцы УА «Барысаўскі дзяржаўны каледж». Бібліятэкар падала маладым людзям інфармацыю аб праблемах ВІЧ/СНІДу і прапанавала абмеркаваць шляхі перадачы ВІЧ-інфекцыі, сімптомы захворвання і спосабы прафілактыкі. У ходзе размовы прысутныя абмяняліся сваімі думкамі аб праблеме: хто найбольш схільны рызыцы ВІЧ інфікавання. У заключэнне дыялогу хлопцы пазнаёміліся з гісторыяй стварэння сімвала барацьбы са СНІДам – чырвонай стужачкі.

Гутарка-парада да Міжнароднага дня памяці ахвяр СНІДА «Контракт с самим собой и с миром» прайшла ў Негарэльскай сельскай бібліятэцы ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма». Фельчар Г.Б. Плугавая агучыла статыстычныя дадзеныя аб колькасці ВІЧ-інфіцыраваных у свеце і ў Рэспубліцы Беларусь, распавяла пра спосабы перадачы ВІЧ-інфекцыі, аб сімптомах ВІЧ-інфекцыі і СНІДу. Бібліятэкар раздала тэматычныя памяткі і інфармацыйны буклет «Вернасць – надзейная абарона ад ВІЧ-інфекцыі», якія змяшчаюць важную інфармацыю аб смяротным вірусе, а таксама распавяла пра людзей, якія памерлі ад гэтай падступнай хваробы.

«ВІЧ-інфекцыя і СНІД – без міфаў і ілюзій» – пад такой назвай адбыўся круглы стол з вучнямі 9 і 10 класаў гімназіі г. Мядзел, арганізаваны ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка». Падчас мерапрыемства падлеткі пазнаёміліся з эпідэміялагічнай сітуацыяй у Мінскай вобласці, атрымалі самую асноўную інфармацыю аб ВІЧ/СНІД: у чым розніца паміж ВІЧ і СНІДам, даведаліся як працуе імунная сістэма чалавека, як пабудаваны вірус, даведаліся пра яго асноўныя шляхі перадачы. З цікавасцю прагледзелі відэаролік «Новае пакаленне без ВІЧ», у якім распавядалася аб статыстыцы заражэнняў ВІЧ-інфекцыяй, дынаміцы эпідэміі, пераважных шляхах перадачы і тэмпах развіцця эпідэміі.

У цяперашні час востра стаіць праблема ўжывання насельніцтвам **алкагольных, слабаалкагольных напояў і**

**піва**, назіраецца рост непаўналетніх, якія ўчынілі злачынствы ў стане алкагольнага ап'янення.

7 красавіка сярод навучэнцаў УА «Маладзечанскі дзяржаўны каледж» адбыўся актуальны дыялог аб шкодзе алкаголю «Глоток беды». Супрацоўнік гарадской бібліятэкі-філіяла № 1 ДУК «Маладзечанская цэнтральная бібліятэка імя Максіма Багдановіча» распавяла навучэнцам, як дрэнна дзейнічае алкаголь на арганізм чалавека і наколькі ён шкодзіць здароўю. Падлеткі прынялі актыўны ўдзел у конкурсе «Слоўнік». Прапаноўвалася чатыры зашыфраваныя словы, якія трэба было аднавіць і пракаментаваць адно з наступстваў п'янства і алкагалізму. У заключэнні мерапрыемства прайшла тэст-гульня «Будуем дом» з выразаных асобных слоў-цаглін, адной камандзе неабходна было «пабудаваць» шчаслівае жыццё, а другой камандзе выбіраць словы негатыўнага значэння і пабудаваць супрацьлегласць «шчаслівага жыцця».

Папулярызацыі здаровага ладу жыцця і прафілактыцы шкодных звычак спрыяюць **клубы і аматарскія аб’яднанні** пры бібліятэках.

Клуб выхаднога дня «Мерыдыян» пры ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» аб’ядноўвае калег бібліятэкараў і актыўных чытачоў-прыхільнікаў тэатра, вандровак, актыўнага і здаровага адпачынку. У справаздачным годзе аб’ектам наведвання стаў Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр у г. Мінску з праглядам лёгкай іранічнай сямейнай камедыі М. Задорнава «Хочу вашего мужа».

Прыхільнікаў здаровага ладу жыцця збірае на свае пасяджэнні культурна-аздараўленчы клуб «Аір» (кіраўнік А.А. Войцік), які больш за 20 гадоў плённа працуе пры ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка». Клуб ставіць сваёй мэтаю выхаванне патрэбы чалавека ў здаровым ладзе жыцця, як спосабе дасягнення гармоніі з навакольным асяроддзем. За гады сваёй дзейнасці ў клубе прайшло шмат цікавых і змястоўных мерапрыемстваў, так у 2022 годзе ў

рамках клуба былі падрыхтаваны і праведзены пасяджэнні на тэмы: «Возвышение желаний или как осуществить себя», «Право на счастье», «Познай и преодолей себя», «Менеджмент вашего здоровья», «Да не погаснет в душах свет».

## Сацыяльна неабароненыя катэгорыі насельніцтва

У бібліятэках Міншчыны створаны базы даных аб ветэранах вайны і працы, адзінокіх састарэлых, інвалідах, хто жыве ў зонах абслугоўвання бібліятэк і патрабуе сацыяльнай апекі і абароны. Кожны год бібліятэкары вобласці праводзяць маніторынг сваёй зоны абслугоўвання, па выніках якога маюць звесткі аб колькасці пажылых людзей і інвалідаў, і складаюць планы работы з гэтымі групамі насельніцтва. Сёння кожны жыхар Міншчыны, які па медыцынскіх прычынах не мае магчымасці наведваць бібліятэку, можа звярнуцца па дапамогу і для яго будзе арганізавана дастаўка кніг і часопісаў на дом. Галоўная задача бібліятэк у гэтым напрамку – далучэнне такіх людзей да кнігі, а галоўная мэта – зрабіць бібліятэку даступнай. З гэтай мэтай бібліятэкары актыўна выкарыстоўваюць у абслугоўванні пазастацыянарныя формы, індывідуальнае абслугоўванне на даму. У гэтым напрамку бібліятэкі працуюць у цесным кантакце з установамі і арганізацыямі, якія ствараюць сістэму падтрымкі пажылых людзей і інвалідаў: органы мясцовай улады, службы сацыяльнай абароны, аховы здароўя, установы культуры, асветы, грамадскія арганізацыі.

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік» працягваў работу з праектам «Библиотека без границ», які прадугледжвае работу менавіта з катэгорыяй інвалідаў і асоб сталага ўзросту. У гэтым праекце вядзецца цеснае супрацоўніцтва з аддзяленнем дзённага знаходжання інвалідаў і пажылых людзей ДУ «Вілейскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва». У 2022 годзе для выхаванцаў аддзялення былі арганізаваны

мерапрыемствы: бібліядайджэст «А Новый год-то будет!», гадзіна цікавых паведамленняў «Цветочная рапсодия», гастранамічная старонка «Пища всякая важна», гадзіна патрыятызму «Партизанскими тропами», агляд навінак «Лучшие книги для семейного чтения», PR-акцыя «Приходите к нам читать! », экалагічны калейдаскоп «Земля – наш общий дом», духоўная гутарка «Православные святыни белорусского народа». У рамках праекта таксама арганізавана надомнае абслугоўванне сталых людзей.

У 2022 годзе набылі таблічкі з раскладам работы ўстановы, выкананай шрыфтам Брайля, у Капыльскую раённую цэнтральную бібліятэку імя Анатоля Астрэйкі і Капыльскую дзіцячую бібліятэку. Абслугоўванне сацыяльна-неабароненых слаёў насельніцтва праводзіцца ў рамках сумеснага праекта ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі» і Капыльскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва «Хай кніга падтрымае Вас», на базе якога працуюць аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў. Вялася работа ў рамках праектаў «Кніжны свет» сумесна с інвалідамі цэнтра і «Старонкі жыцця» сумесна з ветэранамі ТЦСАН. Самыя цікавыя мерапрыемствы – квэст-круіз па Алеі пісьменнікаў «Капыльшчына літаратурная», пазнавальны пазл «Падарожжа па зімовых месяцах», літаратурна-паэтычная гадзіна «Поэзия – великая река».

Бібліятэкі Слуцкага раёна ў 2022 годзе вялі змястоўную працу ў рамках сацыяльнай праграмы «Вера. Надзея. Любоў». Асноўныя адрасаты праграмы: адзінокія, састарэлыя, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянеры, шматдзетныя сем’і; інваліды living рознага ўзросту. Мэта праграмы – стварэнне безбар’ернага бібліятэчнага асяроддзя для дадзеных катэгорый грамадзян. Галоўныя напрамкі праграмы накіраваны на задавальненне індывідуальных інтарэсаў дадзенай катэгорыі карыстальнікаў, змястоўную арганізацыю вольнага часу, магчымасць самарэалізацыі і пошуку новай

сацыяльнай ролі. Работа па праграме плануецца і вядзецца сумесна з грамадскімі арганізацыямі і дзяржаўнымі ўстановамі горада і раёна: ДУ «Слуцкі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва», Слуцкім аддзяленнем ГА «Дзеці ў бядзе», ДУ «Слуцкім цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі дзяцей і падлеткаў».

Праект «Мобильная библиотека» распрацаваны ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» сумесна з Тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва г. Жодзіна. Мэта праекта – зрабіць бібліятэку бліжэй для сацыяльна-неабароненых пластоў насельніцтва. Ён прадугледжвае надомнае абслугоўванне пенсіянераў, інвалідаў сумесна з сацыяльнымі работнікамі. Удзельнікамі праекту ў 2022 годзе сталі 38 чытачоў, было арганізавана 535 наведванняў і выдадзена 1273 кнігі. Абслугоўваліся чытачы-інваліды і людзі сталага ўзросту па месцы жыхарства па заяўцы не радзей як 1 раз у месяц.

У ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка» разам з Валожынскім ПО ОО «БелАПДІіМІ» быў праведзены трэнінг для грамадзян сталага ўзросту «Азбука Интернета. Обучение старшего поколения компьютерной грамотности». Тэмамі трэнінга былі: «Рабочий стол компьютера», «Работа на клавиатуре с мышкой», «Работа в программе Microsoft Word». У другой часцы праграмы слухачоў чакала практычная частка працы на камп’ютары: вучыліся ствараць уліковы запіс ў сацыяльных сетках, заводзілі скрынкі для электроннай пошты і інш.

«Жыццё патрабуе міласэрнасці» – сумесны праект бібліятэкі сямейнага чытання «Верасок» ДУК «Маладзечанская цэнтральная бібліятэка імя Максіма Багдановіча» з аддзяленнем дзённага знаходжання інвалідаў і пажылых грамадзян Маладзечанскага РТЦСАН і ЦКРНіР, накіраваны на адаптацыю ў грамадстве людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Да Міжнароднага дня інвалідаў у ДУ «Маладзечанскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага

абслугоўвання насельніцтва г. Маладзечна» праведзена дабрачынная акцыя «Подари добро и радость».

У Зазерскай сельскай бібліятэцы ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» прайшла інфармацыйная гадзіна «Старость не для насилия», падчас мерапрыемства гаварылі аб правах пажылых людзей, абмяркоўвалі артыкул 10.1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, і артыкулы 147, 154, 186 Крымінальнага кодэкса аб адказнасці грамадзян, якія ўчынілі гвалт у побыце над пажылымі людзьмі. У ходзе правядзення мерапрыемстваў бібліятэкамі распаўсюджвалася друкаваная прадукцыя – інфармацыйныя ўлёткі з карыснай інфармацыяй: «Равенство прав и возможностей», «Льготы пенсионерам» і г. д.

У рамках **Дня пажылога чалавека** прайшоў настальжы-вечар «Горад памятае нас маладымі», які запрасіў на спатканне са сваёй маладосцю паважаных землякоў, якія аддалі райцэнтру запал сваіх сэрцаў і працавітых рук, маральную чысціню і вернасць роднай зямлі. Настальгічная сустрэча – вынік творчага супрацоўніцтва ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка», Бярэзінскага цэнтра культуры і школы мастацтваў. Мерапрыемства падарыла духоўную акрыленасць, захапленне, жаданне памножыць радасныя сустрэчы, каб у душы не згасалі галасы зямляцтва і пачуццё гонару за Бярэзіншчыну.

Напярэдадні Міжнароднага дня пажылых людзей супрацоўнікамі Гарадзейскай гарпасялковай дзіцячай бібліятэкі ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы» былі выраблены буклеты «Нескучная пенсия», азнаёміўшыся з якімі чытачы-пенсіянеры набылі каштоўныя рэкамендацыі пра літаратуру, якая была падабрана, згодна з узроставай перавагай дадзенай катэгорыі чытачоў.

Праграма работы **клубаў** уключае розныя па тэматыцы і форме мерапрыемствы, якія даюць магчымасць пажылым людзям актыўна бавіць вольны час, раскрыць свой унутраны

свет, спрыяюць самарэалізацыі і арганічнай адаптацыі да асяроддзя, падтрымліваюць пазітыўны настрой.

Удельнікі клуба для пажылых людзей ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» «Сустрэча» з задавальненнем наведвалі мерапрыемствы з правядзеннем акцый і конкурсаў. Званым госцем бібліятэчнай гасцёўні клуба «Сустрэча» стаў супрацоўнік раённай газеты «Бярэзінская панарама» Алесь Бычкоў, аўтар 7 кніжных рознажанравых выданняў: правінцыйныя казкі, фэйсбучны раман, аповесці і апавяданні ў стылі фэнтэзі. Арт-сустрэча «Лёсам распісаны ўсе ролі» стала сапраўдным святам у гонар Сусветнага дня тэатра. На спавядальным узроўні прайшоў дыялог з рэжысёрам Узорнага тэатра лялек «Сюрпрыз» з 35-гадовым служэннем Мельпамене Таццянай Верамейчык. На памяць аб сустрэчы гасцям былі ўручаны сяброўскія шаржы-эпіграмы з рэкламай яе творчых і асобасных якасцяў. На пасяджэнне клуба да Дня воінаў-інтэрнацыяналістаў быў запрошаны старшыня Бярэзінскай раённай арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане, індывідуальны прадпрымальнік А.Л. Купіч.

Кожная сустрэча чытачоў «залатога ўзросту» Шчэпіцкай сельскай бібліятэкі ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка» ў клубе «Тыя, хто маладыя душой» праходзіць за кубкам духмянай гарбаты, за ажыўленымі гутаркамі і любімымі песнямі. Многія раскрываюць свае таленты: выконваюць песні, пішуць і чытаюць вершы, дзеляцца сваім вопытам, праяўляюць свае веды і ўменні, пад шолах старонак новай кнігі, любімага часопіса прыемна бавяць вольны час. У справаздачным годзе прайшлі пасяджэнні: «Весенняя гостья масленица», «Весна, девчонки, позитив», «По волнам нашей памяти», «Ах, этот юбилей», «Мой красивый огород – здоровье и доход», «Новогодние посиделки», наведванне палаца Пуслоўскіх і музея-сядзібы Т. Касцюшка ў Косава, пад час якой убачанае і пачутае немагчыма перадаць простымі словамі і аматарскім фота.

Працягваецца сумесная праца аддзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі» з аддзяленнем дзённага знаходжання інвалідаў і людзей сталага ўзросту. Наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў з’яўляюцца членамі клуба «Читаем вместе». З іх удзелам прайшлі наступныя мерапрыемствы: гульня-загадка «Чарадзейства на Каляды», літаратурна-пазнавальная гульня «Познай мир – познай себя», літаратурны калейдаскоп «Книжная радуга», экападарожжа «Свет природы в книгах», бібліяглобус «По странам и континентам», арт-майстэрня «Осенняя фантазия», фальклорныя вячоркі «Кладезь мудрости народной», выстава-віктарына «Зимней праздничной порой».

Таксама ў ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі» працуе аматарскае аб'яднанне «Добрые встречи», на пасяджэннях якога прайшлі наступныя мерапрыемствы: калядныя сустрэчы «Рождества волшебные мгновения», літаратурная рулетка «По волнам литературных юбилеев», гумарына «Первоапрельский Ералаш», літаратурна-музычная гасцёўня «Книги и песни нашей молодости», гадзіна-абмеркаванне «Секреты хорошего урожая», гадзіна цікавага паведамлення «Книжная оранжерея: цветы в литературе», гадзіна рэкламы «Весь хоровод журналов», віншавальная праграма «Новогодний каламбур».

У 2022 годзе ў бібліятэках Мядзельскага раёна працавала 6 аматарскіх аб’яднанняў для пажылых людзей: «Душа» (Будслаўская сельская інтэграваная бібліятэка), «Завалінка» (Крывіцкая пасялковая бібліятэка), «Надзея» (Занарацкая сельская бібліятэка), «Веста» (Нарацкая сельская бібліятэка), «Задушэўная размова» (Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка), «Залаты ўзрост» (Камароўская сельская бібліятэка-клуб), якія на працягу года наведвалі 67 удзельнікаў.

У Мар’інагорскай гарадской бібліятэцы ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» на

працягу многіх гадоў дзейнічае «Клуб цікавых сустрэч», які аб'яднае чытачак-энтузіястак, у якіх ёсць вольны час, жаданне актыўна яго праводзіць, удзельнічаць у жыцці бібліятэкі, сустракацца з цікавымі людзьмі, абменьвацца інфармацыяй, дзяліцца добрымі парадамі і проста размаўляць па душах. З мэтай папулярызацыі бібліятэчнай кнігі, арганізацыі вольнага часу дадзенай групы карыстальнікаў на працягу года арганізоўваўся шэраг мерапрыемстваў: літаратурна-музычныя імпрэзы, літаратурныя падарожжы, вечары-партрэты да юбілейных дат пісьменнікаў і паэтаў і інш. Усяго за 2022 год прайшло 12 пасяджэнняў клуба.

У ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» з 2003 года працуе клуб жанчын паважанага ўзросту «Чысты чацвер». Задача клуба – дапамагчы людзям сталага ўзросту рацыянальна выкарыстоўваць свой вольны час. Удзельнікі могуць паказаць свае веды і ўменні, падзяліцца вопытам, даведацца і ўбачыць нешта новае. Сумесна з Саветам ветэранаў, раённай арганізацыяй ветэранаў працы, таварыствам інвалідаў, раённай арганізацыяй Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, раённым аб'яднаннем прафсаюзаў бібліятэкай праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы для ўдзельніц клуба: рэтра-вечар «Памяць беражліва захоўвае», літаратурны вечар «Святло пагаслай зоркі», прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння беларускага паэта і перакладчыка Генадзя Кляўко, святочная праграма «Материнское счастье», прысвечаная Дню маці. Напярэдадні юбілею беларускага песняра Якуба Коласа бібліятэкары падрыхтавалі цікавы кулінарны калейдаскоп «Разнасолы ад класіка» – пра гісторыю паходжання страў, якія можна сустрэць у эпічнай паэме «Новая зямля». Таксама трэба адзначыць працу па арганізацыі вольнага часу сярод людзей сталага ўзросту, такіх аб'яднанняў як: клуб па інтарэсах «Душэўныя сустрэчы» (Габрыелеўская сельская бібліятэка); клуб «Берагіня» (Свіслацкая гарпасялковая бібліятэка); літаратурна-музычная гасцёўня «В кругу друзей» (Праўдзінская горпасялковая бібліятэка).

У 2022 годзе працягваў сваю дзейнасць клуб для людзей сталага ўзросту «Берагіня Дабрыня» Селішчанскай сельскай бібліятэкі-філіяла № 40 ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка». Праграма работы клуба ўключае розныя па тэматыцы і форме мерапрыемствы, якія даюць магчымасць сталым людзям актыўна бавіць вольны час, раскрыць свой унутраны свет, спрыяюць самарэалізацыі і арганічнай адаптацыі да асяроддзя, падтрымліваюць пазітыўны настрой. Удзельнікі клуба абменьваліся думкамі аб прачытаным, атрымлівалі карысную інфармацыю, арганізоўвалі сумесныя святы, запрашалі на сустрэчу цікавых людзей. Сярод мерапрыемстваў: гістарычны экскурс «Житие преподобного Сергия Радонежского» і літаратурна-музычная сустрэчу «Закружила пора золотая».

Для сталых людзей пры бібліятэках ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка» працуюць клубы: «Пасядзелкі» (цэнтральная бібліятэка), «Залатая восень» (Каваліцкая сельская бібліятэка-клуб), «Суседкі» (Шапчыцкая сельская бібліятэка-клуб). На сваіх сустрэчах удзельнікі клубаў абменьваюцца думкамі аб прачытаным, атрымліваюць цікавую інфармацыю, бавяць вольны час.

# Бібліятэчнае абслугоўванне людзей з абмежаванымі магчымасцямі

Для стварэння даступнага асяроддзя і арганізацыі работы з людзьмі з інваліднасцю ў публічных бібліятэках вобласці прыняты наступныя меры: пры ўваходзе ў памяшканні бібліятэк ёсць поручні і абсталяваны пандусы, уваходныя дзверы маюць пашыраныя праёмы і абазначаны папераджальнымі знакамі «Жоўты круг», устаноўлены кнопкі выкліку персаналу, нанесена каляровая разметка прыступак і ручак дзвярэй, устаноўлены знакі даступнасці аб'екта і інфармацыйныя таблічкі. Таксама ў некаторых бібліятэках створаны дадатковыя ўмовы: пад'ёмная платформа з вертыкальным перамяшчэннем (ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»); парковачнае месца для інвалідаў з абазначэннем паркоўкі для транспарту інвалідаў; у спецыялізаванай бібліятэцы № 5 устаноўлены дакумент-камера IQBoard, ПК з узмацняючай гукавой картай, з калонкамі і навушнікамі, электроннай лупай, якая павялічвае тэкст у 32 разы і вэб-камерай (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); санпакой для інвалідаў (ДУК «Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы»); зала для маламабільных чытачоў, тактыльная плітка (ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»); зона для камфортнай працы: камп'ютар, навушнікі, стэлаж з аўдыёкнігамі, дэма-версія праграмы для саслабелых зрокам «Jaws» (ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы»); шыльда з назвай бібліятэкі, выкананая шрыфтом Брайля (ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча») і іншае.

На 01.12.2022 фонды публічных бібліятэк, якія абслугоўваюць асоб з парушэннем зроку, уключаюць **11,9 тыс.** экзэмпляраў агучанай літаратуры, **0,4 тыс.** экзэмпляраў кніг са шрыфтом Брайля і іншыя спецыялізаваныя выданні.

Акрамя гэтага, у сістэме публічных бібліятэк Мінскай вобласці працуюць **4** спецыялізаваныя бібліятэкі для людзей з парушэннем зроку (гг.: Барысаў, Маладзечна, Слуцк, Чэрвень). Бібліятэчны фонд у спецыялізаваных бібліятэках прадстаўлены сучаснымі спецыяльнымі выданнямі: кнігамі са шрыфтам Брайля, кнігамі з узбуйненым шрыфтам, аўдыёкнігамі. На 01.12.2022 бібліятэчны фонд гэтых бібліятэк складае больш за **10 тыс.** экзэмпляраў. У 2022 годзе да паслуг бібліятэк звярнуліся **466** інвалідаў па зроку і іншых слабавідушчых карыстальнікаў, якім выдадзена **7,3 тыс.** экзэмпляраў дакументаў. Колькасць наведванняў бібліятэк гэтай катэгорыяй карыстальнікаў склала **3,4 тыс.**

Бібліятэкамі распрацаваны і рэалізуюцца праекты і праграмы: «Инклюзия. Библиотека без границ», «Библиотека равных возможностей» (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка ім. І.Х. Каладзеева»), «Милосердие» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»), «Жыццё патрабуе міласэрнасці» (ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»), «Открытый мир» (ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы» сумесна з ДУ «Нясвіжскі раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва»), «Вера. Надежда. Любовь» (ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» сумесна з ДУ «Слуцкі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва», ДУА «Слуцкі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі дзяцей і падлеткаў» і іншымі зацікаўленымі) і іншыя.

Традыцыйна супрацоўнікі публічных бібліятэк выступаюць на прадпрыемствах сістэмы ГА «БелТІЗ» з рэкамендацыйнымі гутаркамі аб фондзе агучанай літаратуры, праводзяць комплекс мерапрыемстваў на розную тэматыку, запрашаюць інвалідаў па зроку на пасяджэнні аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах. Усяго ў 2022 годзе для асоб з парушэннямі зроку арганізавана і праведзена **264** мерапрыемствы, якія наведалі **2,5 тыс.** чалавек.

# Работа бібліятэк у рамках Года гістарычнай памяці

Падчас усіх мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў бібліятэках Мінскай вобласці ў 2022 годзе, незалежна ад формы і тэматыкі, акцэнт рабіўся на тэмы, цесна звязаныя з Годам гістарычнай памяці, падкрэсліваючы яго важнасць і значнасць для ўсяго беларускага народа. У публічных бібліятэках Мінскай вобласці праходзілі мерапрыемствы, прымеркаваныя да знакавых падзей у гісторыі Рэспублікі Беларусь і якія маюць асаблівае гістарычнае і грамадска-палітычнае значэнне.

Да памятнай даты *Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў (15 лютага)* былі праведзены наступныя мерапрыемствы: вечар памяці «Время выбрало вас, закружило в Афганской метели…» (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); гадзіна памяці: «Боль моей души – Афганистан» (ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»); героіка-патрыятычны час «Мы не имеем права забыть» (ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»); гадзіна мужнасці «Дорогами Афганистана» (ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка») і інш.

Да памятнай даты *Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа (22 чэрвеня)*: гістарычна-патрыятычная акцыя «Свеча памяти» (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); паэтычны флэшмоб «…Но о тех, кто уже не придет никогда, заклинаю: помните!» у рамках рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Хвіліна маўчання» (ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»); велапрабег па памятных мясцінах малой радзімы «Чтобы помнили» (ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі»); літаратурна-музычная

вечарына «И песни тоже воевали….» (ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна») і інш.

Таксама ў рамках Года гістарычнай памяці ў публічных бібліятэках быў арганізаваны шэраг сустрэч з удзельнікамі войн і малалетнімі вязнямі канцэнтрацыйных лагероў: сустрэча з ветэранамі «Звезда Подвига» (ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»); інфармацыйная гутарка «Жизнь и смерть за оградой концлагеря» (ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»); урок памяці «Я помню всё...», тэматычны вечар «Память без срока давности» (ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка»); інфармацыйна-патрыятычная кампазіцыя «Памяць і боль беларускай зямлі» (ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка») і інш.

Да *Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) (3 ліпеня)*: патрыятычны рэквіем «Помним. Чтим. Гордимся» (ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»); гістарычная гадзіна «Минувших лет живая память», інтэлектуальная гульня «Занимательная геральдика», інтэрактыўная тэст-гульня «Улицы города Борисова» (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); інтэрактыўная гульня «Собери Беларусь в своем сердце» (ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік»); віртуальнае падарожжа «Памяць далёкай вайны» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»); літаратурна-музычная гасцёўня «Квітней пад небам сінім, Беларусь!» (ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»); літаратурная гасцёўня «Маці-Беларусь, твае сыны жывуць» (ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»); гадзіна памяці «По памятным местам нашего края» (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі»); бібліякешынг «Партизанскими тропами Любанщины» (ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі»); літаратурна-музычная кампазіцыя «В песнях и стихах поэтов, пусть расцветает край

родной» (ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»); гісторыка-патрыятычная гадзіна «Освобождение Беларуси: события, люди, подвиг» (ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча») і інш.

*Да Дня народнага адзінства (17 верасня)*: гадзіна краязнаўства «В единстве народа – сила страны» (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); патрыятычны час «Разам мы – Беларусь» (ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік»); інфармацыйная гадзіна «День, который нас объединяет» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»); літаратурная сустрэча «У адзінстве – сіла кожнага з нас» (ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»); пазнавальны глобус «В исторической памяти сила и единство белорусского народа» (ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка»); гістарычны экскурс «17 сентября – День народного единства» (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі»); інфармацыйная гадзіна «17 верасня – новае свята беларускага каляндара» (ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі»); патрыятычны час «Я живу на белорусской земле» (ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»); гістарычная гадзіна «Под знаком мира, дружбы и добра – одна на всех страна» (ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча») і інш.

Праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне памяці пра вядомых землякоў: гадзіна краязнаўства «Он – наш земляк, он – наша слава», прысвечаная памяці Героя Савецкага Саюза А.К. Харчанкі (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); удзел у літаратурна-музычным свяце «Цымкавіцкія вытокі», прымеркаваным да дня нараджэння Кузьмы Чорнага (ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі»); урачыстае мерапрыемства «Тут на ўсё жыццё прыпісана маё сэрца», прысвечанае

прысваенню бібліятэцы імя пісьменніка-земляка І.А. Муравейкі (ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка імя І.А. Муравейкі»); дзень памяці паэта Максіма Багдановіча «Нязгаснай зоркай ты ў небе Радзімы навекі» (ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»); раённая краязнаўчая канферэнцыя «Асоба ў гісторыі малой радзімы», прысвечаная памяці А. Махнача (ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса»); тэматычны вечар «Мікола Нікановіч – пісьменнік з Кленніка» (ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка ім. М. Багдановіча») і інш

У 2022 годзе публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці сумесна з партнёрамі (Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і яго філіяламі, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, Выдавецкім домам «Звязда» (газетай «Літаратура і мастацтва»), ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», выдавецтвам «Мастацкая літаратура» (часопіс «Полымя») і Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам юнага гледача) быў запушчаны абласны праект «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» (Дадатак 6).

ДУ «Мінская абласная бібліятэка ім. А.С. Пушкіна» ў рамках гэтага праекта сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурным музеем Максіма Багдановіча, прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, каналам «Культура» Беларускага радыё, Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам юнага гледача і Мінскім абласным аддзяленнем «Саюза пісьменнікаў Беларусі» праведзены анлайн-конкурс чытальнікаў «Пад Зоркай Венеры» (для дзяцей ад 6 да 18 гадоў), прысвечаны творчасці Максіма Багдановіча. Конкурс атрымаў статус міжнароднага і сабраў больш за 1800 творчых работ.

Год гістарычнай памяці адзначаны юбілеямі Янкі Купалы і Якуба Коласа, Максіма Танка, якім былі прысвечаны наступныя мерапрыемствы: тэатр-маналога

«Сцяжыны кахання зводзілі нас: Я. Купала і П. Мядзёлка»; літаратурны час «Знаёмы незнаёмец: Я. Брыль» (ГУК «Бярэзінская раённая бібліятэка»); літаратурна-музычная кампазіцыя «Янка Купала: успомнім класіка» (ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева»); віктарына «Твой Пясняр, Беларусь!» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»); гадзіна паэзіі «Вершы ў рытме сэрца», паэтычны нон-стоп «Неутомимый труженик поэзии», прысвечаны да 110-годдзя з дня нараджэння М. Танка (ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік»); паэтычная пляцоўка «Чытаем Купалу і Коласа» (ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»); юбілейны анлайн-чэлендж «Не умолкнет голос Песняров» (ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»); бібліяпрыступкі «Вуснамі Купалы і Коласа загаварыла Беларусь» (ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка») і інш.

З мэтай падтрымкі і развіцця творчых здольнасцей моладзі сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі ў 2022 годзе ў г. Лагойску прайшоў абласны форум маладых паэтаў Міншчыны «Слова Купалы да творчасці кліча».

## Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ажыццяўляецца на аснове даведачна-бібліяграфічнага фонду, традыцыйнага даведачна-бібліяграфічнага апарата, а таксама электронных рэсурсаў.

На працягу года бібліятэкі вобласці працягвалі працу па выкананні бібліяграфічных даведак. У 2022 годдзе ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева» было выканана **3350** даведак, ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» – **972** даведкі, ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» – **206,** ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса» – **92** даведкі, ДУ «Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка» – **365** даведак, ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» – **7932** бібліяграфічныя даведкі.

Бібліятэкі вобласці праводзяць актыўную работу па ўдасканаленні сістэмы каталогаў і картатэк. У мінулым годзе СКА былі дапоўнены новымі тэматычнымі рубрыкамі. Для зручнасці і аператыўнасці выканання тэматычных запытаў чытачоў, а таксама ў сувязі са знамянальнымі датамі ў грамадскім і палітычным жыцці рэспублікі ў сістэматычнай картатэцы газетных і часопісных артыкулаў уведзены новыя прадметныя рубрыкі, такія як: «2022 год – Год гістарычнай памяці», «140 год з дня нараджэння Я. Купалы», «140 год з дня нараджэння Я. Коласа» (ДУК «Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы»), «2022 – Год гістарычнай памяці», «140-годдзе Я. Коласа і Я. Купалы» (ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»), «Год гістарычнай памяці»; «Зімовыя Алімпійскія Гульні ў Пекіне-2022» (ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка»), «2022 год – Год гістарычнай памяці», «75 гадоў з дня нараджэння Георгія Марчука», «85 гадоў з дня нараджэння Мікалая Чаргінца», «95 гадоў з дня нараджэння Алеся Адамовіча», «100 гадоў з дня нараджэння

Алены Васілевіч», «105 гадоў з дня нараджэння Янкі Брыля», «105 гадоў з дня нараджэння Пімена Панчанкі», «110 гадоў з дня нараджэння Максіма Танка», «140 гадоў з дня нараджэння Якуба Коласа», «140 гадоў з дня нараджэння Янкі Купалы» (ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка»), «2022 – Год гістарычнай памяці», «17 верасня – дзень народнага адзінства», «Уроки пандемии», «В поисках утраченного», «Точка на карте», «Наркотики», «Будзь у курсе» (ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка»), «2022 год – Год гістарычнай памяці», «Ён ведаў народнае жыццё», «Янка Купала. Жыццё і творчасць», да 140-годдзя з дня нараджэння народных пісьменнікаў Беларусі Я. Коласа і Я. Купалы (ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса»), «Да 140-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы», «Да 140-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа», «Да 110-годдзя з дня нараджэння М. Танка» (ДУ «Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка»).

Бібліятэкі фарміруюць даведачна-бібліяграфічны апарат праз папаўненне электроннага каталога артыкулаў аналітычнымі бібліяграфічнымі запісамі.

БД «Статьи» ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік» папоўнілася на **292** адзінкі і сёння ўтрымлівае **7160** запісаў. БД «Аналітыка» Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева папоўнілася на **1447** запісаў. У бібліяграфічную БД «Сістэматычная картатэка артыкулаў» ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка» за мінулы год было ўведзена **183** запісы. БД «Артыкулы» электроннага каталога ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» папоўнілася **3084** запісамі і на 31.12.2022 года склала **58067** запісаў. БД «Аналітыка» Лучнікоўскай сельскай бібліятэкі-філіяла № 7 Слуцкага раёна папоўнілася на **200** і сёння налічвае **49560** запісаў. Электронная падбаза «Аналітыка» ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса» папоўнілася на **850** і на канец 2022 года налічвала адпаведна **4893** запісы. ДУК «Бярэзінская

цэнтральная раённая бібліятэка» працягвала папаўненне электроннай базы даных «ALIS-Аналітыка» новымі бібліяграфічнымі запісамі – на сённяшні дзень БД «Аналітыка» налічвае **1872** бібліяграфічныя запісы. На канец 2022 года БД «Аналітыка» ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы» налічвае **8883** запісы, электронны каталог сістэмы складае **63255** бібліяграфічных запісаў.

Ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці працуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ), якія ўяўляюць сабой пункты свабоднага доступу грамадзян да афіцыйнай прававой інфармацыі. Усе цэнтральныя бібліятэкі прадастаўляюць карыстальнікам доступ да прававой БД «Эталон», якая з'яўляецца дзяржаўным інфармацыйна-прававым рэсурсам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

У 2022 годзе ў рамках супрацоўніцтва з натарыяльнай канторай Барысаўскага раёна і Юрыдычнай кансультацыяй г. Барысава на базе ПЦПІ Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева для карыстальнікаў бібліятэкі было праведзена 12 кансультацый натарыусаў і адвакатаў на бясплатнай аснове.

Актыўна супрацоўнічае з калегіямі адвакатаў і прадстаўнікамі праваахоўных органаў ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік». Гэтаму спрыяе дамоўленасць паміж Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі і Беларускай натарыяльнай палатай па арганізацыі і правядзенні на базе ПЦПІ кожны першы і трэці чацвер месяца на бясплатнай аснове кансультацый, семінараў і іншых мерапрыемстваў па прававой адукацыі насельніцтва. Усяго работнікамі натарыяльнай канторы непасрэдна ў ПЦПІ праведзена 5 кансультацый па наступных пытаннях: «Долевае будаўніцтва», «Льготы маладой сям'і», «Сацыяльныя льготы інвалідаў 2-й групы», «Змены ў пенсіённым заканадаўстве», «Вырашэнне працоўных спрэчак». Фарміраванні юрыдычных ведаў і прававой

культуры насельніцтва садзейнічалі наступныя мерапрыемствы, арганізаваныя цэнтрам ПЦПІ аддзела абслугоўвання і інфармацыі: размова-дыялог «Я и мои права» (на базе Вілейскага дзяржаўнага каледжа), відэапрэзентацыя да Дня герба і флага Рэспублікі Беларусь «Гимн, герб, флаг – символы величия и духа моей страны», выстава-вернісаж «Дзяржаўная сімволіка Беларусі і гісторыя яе развіцця», кніжная выстава да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь «Закон для всех и каждого».

У рамках праекта «Абарані сябе сам» ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы» працягвае сваю працу рубрыка «Прававы мерыдыян», якая дае магчымасць атрымаць бясплатную кансультацыю юрыста любому, хто звярнуўся па дапамогу.

Бібліятэкі Міншчыны праводзяць працу па абслугоўванні абанентаў калектыўнага і індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання. Бібліяграфічнай службай ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» складзены інфармацыйна-бібліяграфічныя спісы літаратуры для педагогаў школ горада па тэмах: «Любіць радзіму – значыць ахоўваць прыроду», «Сцэнарныя матэрыялы па прапагадзе здаровага ладу жыцця сярод школьнікаў». Настаўнікам вясковых школ былі адрасаваны Дні інфармацыі «Класнаму кіраўніку на заметку», «Педагагічная капілка», «Навінкі сучаснага беларускага рамана». Для маладых чытачоў бібліятэкі падрыхтаваны інфармацыйна-бібліяграфічныя спісы па актуальных прававых пытаннях «Заставайся на лініі жыцця», спіс нарматыўных дакументаў.

На індывідуальным інфармаванні ДУ «Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» знаходзіцца 26 абанентаў, якія былі праінфармаваны аб 831 выданні рознай тэматыкі: «Працоўнае заканадаўства», «Народная культура Беларусі», «Сацыяльныя аспекты рыначнай эканомікі», «Сацыяльная работа ў школе», «Музеі. Музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь» і інш. Групавой інфармацыяй было забяспечана 27 абанентаў. Усяго за год ім рэкамендавана 512

выданняў па тэмах: «Выхаваўчая сістэма сучаснай сельскай школы», «Развіццё сельскай гаспадаркі на сучасным этапе», «Дзейнасць органаў мясцовай улады на сучасным этапе», «Сучасная сістэма дашкольнага выхавання» і інш.

ДУК «Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна» праводзіла інфармаванне па тэмах: «Что изучает наука астрономия», «Художественная литература: белорусская, русская, зарубежная, новые произведения, новые имена», «Отдел кадров. Пенсионное законодательство Республики Беларусь». Індывідуальным абанентам выдадзены 41 дакумент, групавым 36 дакументаў.

Бібліятэкі Клецкага раёна ў 2022 годзе абслужылі 26 калектываў па 26 тэмах; ім даслана – 104 інфармацыі. Калектыўную інфармацыю атрымліваюць жывёлагадоўчыя комплексы, малочна-таварныя фермы, рамонтныя майстэрні, дзіцячыя сады, сельскія Саветы, школы, групы па інтарэсах і іншыя. Індывідуальную інфармацыю па розных пытаннях прафесійнай дзейнасці і асабістых інтарэсах атрымліваюць 48 абанентаў, якія інфармуюцца па 48 тэмах. Ім паслана 552 інфармацыі аб новых паступленнях літаратуры.

Паслугамі індывідуальнага інфармавання ДУК «Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы» карысталіся прадпрымальнікі, юрысты, настаўнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі. Калектыўную інфармацыю атрымлівалі 4 арганізацыі аграпрамысловага комплексу, школы, дзіцячага сада, дамы культуры.

Для інфармавання чытачоў аб новай літаратуры ў дапамогу прафесійнаму чытанню ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка» ажыццяўлялася групавое інфармаванне 33 калектываў па тэмах: «Игры и развлечение дошколят», «Физическое воспитание и здоровье школьников», «Воспитательный процесс: теория и практика», «Медыцына на службе здароўя чалавека», «Новая літаратура ў дапамогу вучэбнаму працэсу і самаадукацыі настаўнікаў і выхавацелей», «Літаратура ў дапамогу выхаванню дашкольнікаў і самаадукацыі выхавацелей»,

«Тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў, эксплуатацыя аўтамабіляў, захаванне перавозных грузаў, бяспека руху на аўтамабільным транспарце», «Радуга идей», «Обучение. Воспитание. Развлечения», «Краски и ноты», «Праздники, сценарии, затеи», «В помощь учителю», «Казкі і гісторыі», «Чытаем у вольны час», «Завітала ў госці казка», «У дапамогу пазакласнаму чытанню», «У свеце дзіцячай літаратуры», «Беларуская літаратура. Творчасць паэтаў і пісьменнікаў», «Метадычныя распрацоўкі», «Новае ў сельскай гаспадарцы», «Чалавек – творца свайго здароўя», «Почемучка узнаёт мир», «Будзе вольны час – пачытай ты нас», «Крытыка і літаратуразнаўства», «Будзем здаровы». Было складзена 105 інфармацыйных спісаў.

ДУК «Любанская раённая цэнтральная бібліятэка» праводзіла індывідуальнае інфармаванне для 69 абанентаў, сярод якіх кіраўнікі і вядучыя спецыялісты ўстаноў горада і раёна, спецыялісты народнай гаспадаркі, медыцынскія работнікі, работнікі АПК, выхавальнікі і настаўнікі навучальных устаноў, кіраўнікі гурткоў і аматарскіх аб'яднанняў, выхавальнікі дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, а таксама пенсіянеры, інваліды, вучні школ і інш. Сярод тэм індывідуальнага інфармавання можна вылучыць наступныя: «Чырвоны крыж. Валанцёрства», «Дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Прыёмныя і патранажныя сем'і», «Абрадавая дзейнасць і фальклор Любаншчыны», «Музеи Беларуси на страницах СМИ», «COVID-19», «Вакцынацыя супраць каронавіруснай інфекцыі», «Псіхалогія сямейных адносін», «Усё пра рыбную лоўлю», «Кансультацыя юрыста», «Вырабы з падручнага матэрыялу», «Кухня розных краін» і інш. Групавое інфармаванне вялося для 62 абанентаў, сярод якіх: сельскія Саветы, Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, Дзіцячая школа рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, Любанская дзіцячая школа мастацтваў, установы аховы здароўя, Дамы культуры, калектывы навучальных устаноў раёна, а таксама калектывы

мастацкай самадзейнасці, фальклорныя ансамблі, гурткі, аматарскія клубы і аб'яднанні. Яны інфармаваліся па такіх тэмах: «Клопат. Дабрыня. Міласэрнасць», «Літаратурныя навінкі для малодшых школьнікаў», «Здаровы лад жыцця», «Новая літаратура для пазакласнага чытання», «Фальклор. Этнаграфія. Народныя звычаі», «Сацыяльнае абслугоўванне», «Любаншчына на старонках рэспубліканскага друку», «Культурная спадчына ад пакалення да пакалення», і інш.

На індывідуальнае інфармаванне бібліятэкамі Мінскага раёна было ўзята 30 абанентаў, якія атрымлівалі інфармацыю па тэмах «Прафілактыка хвароб с/г раслін», «Гісторыя Беларусі», «Гісторыя Заслаўя», «Рэлігія. Вераванні. Богаслоўе», «Навука», «Генацыд беларускага народа», «Методыка работы па краязнаўству», «Мір вялікага казачніка», «Делопроизводство», «Садоводство и огородничество», «Канцэпцыя і методыкі фарміравання разумовай дзейнасці ў дзяцей дашкольных навучальных установ», «Белорусский фольклор», «Педагогическое воспитание», «Экалагічнае выхаванне», «Папулярызацыя беларускай літаратуры», «Эстэтычнае выхаванне», «Школа здоровья», «Мой агарод», «Урожай круглый год», «Гісторыя Айчыны», «Маляванне ў розных мастацкіх тэхніках. Лепка», «Вырабы з фетра, фаамірана, выраб дэкарытыўных кветак», «Вязанне кручком і спіцамі», «Спорт. Экстрэмальныя і нестандартныя віды», «Своими руками», «Маленькие профессоры» і інш.

ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» адпраўлялі для абанентаў спісы новых паступленняў па тэмах: «Нетрадыцыйная медыцына», «Патрыятычнае выхаванне», «Новая літаратура ў дапамогу навучальнаму працэсу», «Добрыя парады для вашага здароўя» і інш.

На працягу года сетка публічных бібліятэк Смалявіцкага раёна інфармавала індывідуальных і групавых абанентаў па тэмах: «Ветэранскі рух», «Валанцёрства», «Патрыятычнае выхаванне моладзі», «Адзіныя дні інфармавання насельніцтва», «Воінскія пахаванні»,

«Сустрэчы ў працоўных калектывах», «Інавацыі ў бібліятэчнай справе», «Фарміраванне і развіццё дробнай маторыкі ў дзяцей», «Лідары чытання 2020–2022», «Лепшыя кнігі адыходзячага года», «Самыя яркія кніжныя навінкі сакавіка» і інш.

На індывідуальнае інфармаванне ДУК «Салігорская цэнтральная раённая бібліятэка» ўзята 70 абанентаў па 63 тэмах: «Воспитание детей. Психологические аспекты», «Розы и уход за ними», «Поделки своими руками: новое», «Современная дача: советы начинающим», «Новинки белорусской поэзии и прозы», «Водоемы в саду», «Новое в кадровой работе», «Методика преподавания белорусского языка», «Живопись. Графика. Фотография» і інш. Прадастаўлена 266 інфармацый. На калектыўнае інфармаванне ўзята 113 абанентаў па 44 тэмах: «Новая літаратура ў дапамогу навучальнаму працэсу», «Кулінарыя. Грамадскае харчаванне», «Служба быту ў Беларусі», «Гандаль. Камерцыйная дзейнасць», «У дапамогу медыцынскаму работніку», «Новая літаратура ў дапамогу эканамісту і бухгалтару», «Новая літаратура па сельскай гаспадарцы», «У дапамогу жывёлаводам» і інш. Прадастаўлена 390 інфармацый.

ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка» праводзіць інфармаванне насельніцтва праз выставы новых паступленняў, гадзіны інфармацыі, групавое і індывідуальнае інфармаванне. Абанентамі групавога інфармавання звычайна з’яўляюцца школы, дзіцячыя сады, групы спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Тэмы групавога інфармавання адпавядаюць напрамку дзейнасці ўстаноў: «Развіццё і выхаванне дзіцяці», «Ландшафны дызайн», «Вандроўка па родным краі», «Прафесійная дзейнасць», «Будаўніцтва», «Комнатные растения», «Інтэр’ер», «Спорт», «Здаровы лад жыцця», «Кулінарыя», «Жыллёвае пытанне».

Абаненты групавога і індывідуальнага інфармавання ДУК «Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка» атрымлівалі інфармацыю па тэмах: «Давайце чытаць разам»,

«SMS: События. Мнения. Сообщения», «Давайце чытаць разам», «Прафесійнае вызначэнне асобы», «Мая радзіма – мой лёс!», «Маршруты малой радзімы».

На індывідуальным інфармаванні ў ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса» знаходзяцца 6 абанентаў па тэмах: «Сучасная беларуская літаратура», «Беларусь на сучасным этапе», «Дашкольная педагогіка», «Літаратуразнаўства», «Сусветная мастацкая культура», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Заканадаўства РБ», «Сямейнае права». Абанентамі індывідуальнага інфармавання з’яўляюцца кіруючыя работнікі, спецыялісты ў галіне культуры, аматары чытання. Групавое інфармаванне ажыццяўлялася праз складанне штоквартальных спісаў для 4 абанентаў па 13 тэмах: «Дашкольная педагогіка», «Дашкольнае выхаванне», «Дзіцячая псіхалогія», «Школьная педагогіка», «Псіхалогія школьніка», «Арганізацыя вольнага часу», «Методыкі выкладання асобных прадметаў», «Мастацтва: жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, музыка, харэаграфія», «Методыка выкладання мастацтва», «Арганізацыя вольнага часу», «Краязнаўства», «Музейная справа», «Гісторыя Беларусі».

ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка» мае на індывідуальным інфармаванні 22 абанента па 21 тэме. Даслана 143 інфармацый па тэмах: «Мастацтва відовішчаў. Масавыя забавы, гульні», «Хатняя ферма», «Картофелеводство», «Работа з дзецьмі па ўсебаковым развіцці» і інш. На групавым інфармаванні знаходзілася 10 калектываў па 9 тэмах, даслана 48 інфармацый.

